**7 сакавіка 1959 год. Аб’яднанне калгасаў.** У лютым 1959 года ў сельгасарцелі “Савецкая Беларусь” адбыўся справаздачны сход. Спачатку калгаснікі заслухалі справаздачу старшыні праўлення тав. Патапенкі М.З., падвялі вынікі работы за год. Затым сход вынес рашэнне аб’яднаць сельгасарцель “Савецкая Беларусь” з калгасам імя Лепяшынскага, якое прынята аднагалосна.

Выбран новы склад праўлення ўзбуйненага калгаса. Старшынёй праўлення аднадушна абран Пётр Аляксеевіч Нядбайлаў.

**Сцепаненка, І. Аб’яднанне калгасаў / І. Сцепаненка // Авангард. - 1959. - 7 сакавіка. – С.4.**

**21 сакавіка 1959 год. Новы васьмікватэрны дом.** Па вуліцы імя Леніна ў Карме пачынаецца будаўніцтва новага васьмікватэрнага дома. На яго будаўніцтва будзе выдаткавана 297 тысяч рублёў.

Будаўнічыя работы вытварае Гомельскі будаўнічы трэст №10. На будаўнічую пляцоўку завозяцца цэгла, камень і іншыя матэрыялы. Дом будзе здадзен у эксплуатацыю ў гэтым годзе.

**Новы васьмікватэрны дом // Авангард. - 1959. - 21 сакавіка. – С.4.**

**31 сакавіка 1959 год. Пачалася навігацыя.** Сож поўнасцю ачысціўся ад лёду. 26 сакавіка з Гомельскага порта выйшаў у рэйс першы пасажырскі цеплаход №0153 па лініі Гомель-Слаўгарад.

Кошт білета з Кармы да Гомеля 13 рублёў 70 капеек. Цеплаход прыбывае ў Карму ў 5 гадзін раніцы і адпраўляецца на Гомель у 21 гадзіну 15 мінут.

Прыбылі першыя грузы ў Карму і адпраўлены з Кармы на Гомель. У хуткім часе ў раён прыбудуць грузы з пасяўнымі матэрыяламі.

**Пімашэнка, І. Пачалася навігацыя / І. Пімашэнка // Авангард. - 1959. - 31 сакавіка. – С.1.**

**31 сакавіка 1959 год. Працуе музыкальны гурток.** Другі месяц пры раённым Доме культуры працуе гурток баяністаў, у якім навучаюцца 46 аматараў музыкі. Гурткоўцы раздзелены па групах, у ліку якіх – 2 групы хлопчыкаў школьнага ўзросту, 1 – дзяўчынак і 1 група дарослых.

Заняткі праводзяцца 2 разы ў тыдзень: па панядзелках і пятніцах.

Пройдзе чатыры гады, і юныя аматары музыкі стануць баяністамі.

1 красавіка пры РДК адкрыюцца таксама курсы кройкі і шыцця, на якіх будуць навучацца 20 чалавек. Заняткі запланавана праводзіць чатыры разы ў тыдзень, па 2-3 гадзіны. Тэрмін навучання – 6 месяцаў.

**Шчэрбітаў, А. Працуе музыкальны гурток / А. Шчэрбітаў // Авангард. - 1959. - 31 сакавіка. – С.1.**

**1 сакавіка 1969 год. Коратка аб розным.** У Карме адчыніў дзверы чатырохпавярховы будынак інтэрната. Яго навасёламі сталі рабочыя і служачыя перасоўнамеханізаванай калоны №50.

**4 сакавіка 1969 год. Наш госць – артыстка Людміла Марчанка.** Вялікай прыцягальнай сілай валодае кінамастацтва. Нават цяпер, калі ў наш быт трывала ўвайшло тэлебачанне са сваімі асаблівасцямі, яно па-ранейшаму стаіць на пярэднім краі, нясе ў масы таму прыгажосці, эстэтычна выхоўвае гледача. Па-ранейшаму нярэдка ў кінатэатры, калі ідзе добры фільм, можна пачуць:

- Можа ёсць лішні білецік?

Так было нядаўна і ў Кармянскім раённым Доме культуры. Праўда, на гэты раз гледача чакала сустрэча не з новай работай кінематаграфістаў, а з артысткай кіно, нашай зямлячкай Людмілай Марчанка.

Гэта актрыса знаёмая нам па многіх мастацкіх карцінах: “Да будучай вясны”, “Цыган”, “Белыя ночы” і г.д. Яна выконвала і вядучыя, і малыя ролі, але ў кожнай з іх старалася стварыць запамінальныя вобразы і, праўду кажучы, дасягала гэтага, бо ў яе ёсць невычарпальныя запасы майстэрства.

І вось перад прысутнымі выступае Людміла Марчанка. Яна расказвае аб сваіх новых ролях, аб сумеснай рабоце з вядомымі акцёрамі Інакенціем Смактуноўскім, Алегам Стрыжэнавым і іншымі. Асобна спынілася артыстка на сваім дзеле ў стварэнні фільма “Цыган”. Між іншым, гэта карціна адна з лепшых у нашым кіно. У “Цыгане” Марчанка выконвае ролю жонкі Будулая. Хаця і роля не з вядучых, як кажуць, эпізадычная, але актрыса здолела паказаць увесь трагізм, які нясе вайна чалавеку. І ў “Белых начах” мы сустракаемся з Людмілай Марчанка, як з актрысай, якая ўмее тонка перадаць перажыванні сваёй гераіні, прыцягвае да сябе вялікім майстэрствам.

**Пахомава, Н. Наш госць – артыстка Людміла Марчанка / Н. Пахомава // Зара над Сожам. – 1969. - 4 сакавіка. – С.2.**

**27 сакавіка 1984 год. Прысвоены ганаровыя званні.** У калектыве філіяла №2 РВТА “Чырвоны Кастрычнік” шырыцца рух за прысваенне брыгадам за звання “Калектыў камуністычнай працы”.

Першай гэтага звання ўдастоена брыгада, якую ўзначальвае памочнік майстра Іван Іванавіч Зайцаў.

Па выніках мінулага года ганаровае званне “калектыў камуністычнай працы” прысвоена тром брыгадам. Калектывы іх узначальваюць Галіна Іванаўна Якаўлева, Яўген Міхайлавіч Шурын, Станіслаў Іванавіч Бабкоў.

**Коршыкава, Л. Прысвоены ганаровыя званні / Л. Коршыкава // Зара над Сожам. – 1984. - 27 сакавіка. – С.2.**

**30 сакавіка 1989 год. Дом культуры расчыняе дзверы.** З году ў год растуць і прыгажэюць Кароцькі – цэнтральная сядзіба саўгаса “Кармянскі”. Вёска ўсё больш набывае абрысы пасёлка гарадскога тыпу, прычым асаблівая

ўвага надаецца ўзвядзенню аб’ектаў жыллёвага і сацыяльна-культурнага прызначэння. На гэтыя мэты гаспадарка штогод выдаткоўвае са сваёй касы значныя сумы грошай. Вось і ў пачатку бягучага года ў адміністрацыйным цэнтры здадзены ў эксплуатацыю і добра ўпісаўся ў вясковы пейзаж будынак прывабнай архітэктурнай формы – новы сельскі Дом культуры.

Агульная каштарысная вартасць ачага культуры, узведзенага Кармянскай МПМК – 102 на сродкі саўгаса, склала каля 750 тысяч рублёў. У ім ёсць глядзельная зала на 240 месц, светлыя прасторныя вестыбюлі, танцавальная зала, прадугледжаны пакоі для заняткаў гурткоў мастацкай самадзейнасці і па інтарэсах, службовыя памяшканні і інш.

А на чарзе - новае наваселле ў грамадскім сектары. У ліпені яго справяць ва ўзводзімым будынку новай сярэдняй школы тутэйшыя вучні і настаўнікі, узводзіцца ў вёсцы і свой стадыён.

**Феакцістаў, Р. Дом культуры расчыняе дзверы / Р. Феакцістаў // Зара над Сожам. – 1989. - 30 сакавіка. – С.2.**

**Агляд падрыхтавала бібліятэкар-краязнаўца цэнтральнай раённай бібліятэкі Агеенка Ю.В.**